**С.В.Зыгмантовіч**, *дацэнт*

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭКАРАЎ У СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Адна з ключавых праблем сённяшняга дня ў прафесійнай адукацыі бібліятэкараў заключаецца ў вызначэнні асноўнай ідэі, якая будзе пакладзена ў канцэпцыю іх падрыхтоўкі. Паступаюць прапановы аб змене назвы спецыяльнасці, якія матывуюцца, з аднаго боку, імкненнем надаць ёй больш сучаснае гучанне, а з другога – рэакцыяй на кан'юнктуру існуючага рынку працы.

Выказваецца ідэя аб пашырэнні спектра падрыхтоўкі выпускнікоў універсітэта з улікам магчымасці іх працы ў розных галінах сістэмы дакументных камунікацый. Гэты падыход рэалізуецца ў многіх замежных краінах. Разглядаюцца пытанні ўзгодненасці і уніфікацыі праграм падрыхтоўкі, адзіных падыходаў і метадычных рашэнняў навучання інфарматараў-дакументалістаў, бібліятэкараў і архівістаў. Нельга не ўлічваць вопыт у гэтым кірунку, тым больш што ён адпавядае канцэптуальным падыходам да пабудовы сучаснай сістэмы адукацыі, звязаным з неабходнасцю інтэрнацыяналізацыі, глабалізацыі, уліку сусветных інтэграцыйных працэсаў у розных сферах грамадскага жыцця.

Адзначым, што ўжо зараз адбываюцца змены ў змесце навучання, пашыраецца інфармацыйная складаючая ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Вучэбныя курсы становяцца больш складанымі, глыбокімі, інфармацыйна насычанымі, адлюстроўваюць працэсы канвергенцыі бібліятэчнай справы і інфарматыкі. Указаным асаблівасцям навучальнага працэсу павінна адпавядаць і змена ў назве кваліфікацыі. Так, М.Г.Вохрышава лічыць, што дадзеным патрабаванням адпавядае назва «спецыяліст у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і бібліяграфіі» (Библиография. – 2001. – №1. – С.28.).

Сёння на ФБІС навучанне вядзецца па 11 спецыялізацыях (у рамках спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», пры-


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чым калі адны спецыялізацыі, напрыклад «бібліятэказнаўства і бібліяграфія старажытнай і рэдкай кнігі», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія і краязнаўства», «публічныя бібліятэкі», «навукова-тэхнічныя і спецыяльныя бібліятэкі», даюць магчымасць больш глыбока вывучыць спецыфіку і падрыхтаваць спецыялістаў для работы ў пэўным тыпе бібліятэк або з канкрэтнымі відамі дакументаў, выконваць пэўныя функцыянальныя абавязкі, то такія, як «бібліятэказнаўства і бібліяграфія і беларуская мова і літаратура», «кнігазнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю», дазваляюць па сутнасці атрымаць дзве спецыяльнасці, мець больш шырокую кваліфікацыю і адпаведна больш шырокія функцыянальныя магчымасці прымянення сваіх ведаў у будучым. Менавіта па гэтым шляху ідзе развіццё падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў на факультэце, аб чым сведчаць і План падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры (2002–2005 гг.), і прапанаваныя кваліфікацыі ў агульнарэспубліканскі класіфікатар спецыяльнасцей і кваліфікацый. Сярод гэтых кваліфікацый – «бібліятэкар-бібліёграф», «бібліятэкар-бібліёграф – менеджэр», «бібліятэкар-бібліёграф-спецыяліст па АБІС», «бібліятэкар-бібліёграф – спецыяліст па інфармацыі», «бібліятэкар-бібліёграф – перакладчык», «бібліятэкар-бібліёграф – таваразнаўца», «бібліятэкар-бібліёграф – выкладчык мовы і літаратуры». У былым класіфікатары была адна кваліфікацыя – «бібліятэкар-бібліёграф».

Такі падыход у сённяшніх умовах (калі няма магчымасці адкрываць новыя спецыяльнасці) падаецца перспектыўным: паступова адбываецца пераход ад вузкапрафіляванай спецыяльнасці, захоўваецца базавая прафесія, і ў той жа час яна разглядаецца пашырана як кваліфікацыя работніка ў сістэме камунікацый. Гэта дае магчымасць арыентавацца пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў на сучасную канцэпцыю інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыйнага асяроддзя, згодна з якой усе ўстановы, звязаныя з апрацоўкай, пошукам і распаўсюджваннем інфармацыі, могуць служыць аб'ектам прыкладання прафесійных ведаў і ўменняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выпускнікоў факультэта. Названыя арыенціры патрабуюць паглыблення інфармацыйна-тэарэтычнай і тэхналагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Такі падыход будзе аказваць уплыў таксама на станоўчы імідж і прывабнасць прафесіі для абітурыентаў.

Новай бібліятэчна-інфармацыйнай інфраструктуры патрэбны кадры, здольныя не толькі атрымліваць, захоўваць і выкарыстоўваць інфармацыйныя сістэмы, але і фарміраваць у грамадстве інфармацыйнае мысленне. Сама спецыфіка вышэйшай бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі заключаецца ў тым, што бібліятэкар-бібліёграф выступае ў дзвюх іпастасях: з аднаго боку, ён з'яўляецца аб'ектам інфармацыйнага ўздзеяння, для яго інфармацыйная культура – аснова прафесіяграмы, а яе кампаненты ўваходзяць у ядро прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, а з другога – ён жа выступае і суб'ектам актыўнай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці як прафесіянал, што ўдзельнічае ў фарміраванні інфармацыйнай культуры грамадства і пэўнай асобы. Менавіта такі прафесіянал мог бы інтэграваць веды і ўменні інфармацыйных і педагагічных прафесій і мог бы справіцца з задачай фарміравання інфармацыйнай культуры асобы.

Увядзенне названых спецыялізацый не патрабуе дадатковых рэгламентуючых дакументаў, у якіх дзяржава задае стандарты вышэйшай прафесійнай адукацыі. Вядучым метадалагічным прынцыпам дзяржаўных адукацыйных стандартаў з'яўляецца спалучэнне базавага (адзінага для ўсіх) і варыятыўнага кампанентаў у змесце навучання. Базавы кампанент забяспечвае засваенне фундаментальных базавых ведаў, неабходных кожнаму спецыялісту, незалежна ад спецыялізацыі, развіццё матывацыі прафесійнай дзейнасці. Дасягаецца гэта з дапамогай блокаў агульнагуманітарных, сацыяльна-эканамічных, культуралагічных і агульнапрафесійных бібліятэчна-бібліяграфічных і інфармацыйных дысцыплін. Увядзенне курса "Інфармацыйная культура асобы" ў склад агульнапрафесійных дысцыплін базавага кампанента ДАСТ дапамагае фарміраваць у студэнтаў-бібліятэкараў сістэмнае масленне, «філасофію» інфармацыйнай культуры асо-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бы (спецыяліста). Названы курс, раскрываючы гуманітарныя асновы інфарматызацыі, яе грамадскія, прававыя, маральна-этычныя аспекты, з'яўляецца базавым для падрыхтоўкі студэнта да самастойнага мадэлявання інфармацыйных паводзін, дазваляе развіваць уменні прымяняць атрыманыя па іншых агульнапрафесійных дысцыплінах веды.

Варыятыўны кампанент прадугледжвае пашырэнне магчымасцей асобы ў выбары шляхоў прафесійнага і асабістага развіцця. Ён накіраваны на пашырэнне магчымасцей самарэалізацыі асобы ў прафесійнай сферы, прадугледжвае развіццё і актуалізацыю наменклатуры спецыялізацый, якія адпавядаюць дынамічна зменлівым умовам рынку працы ў краіне, патрэбнасцям бібліятэк у пэўных катэгорыях спецыялістаў. Вопыт падрыхтоўкі на ФБІС выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры можна паспяхова скарыстаць пры падрыхтоўцы варыятыўнага кампанента ДАСТ.

У варыятыўны кампанент ДАСТ трэба ўключыць дысцыпліны, якія будуць накіраваны на раскрыццё асноўных змястоўных аспектаў дысцыплін інфармацыйнага цыкла, будуць садзейнічаць вывучэнню асаблівасцей выкладання дадзеных дысцыплін, фарміраванню адпаведных уменняў і навыкаў, пашырэнню кругагляду ў галіне агульнай культуры, сацыяльнай (узроставай) педагогікі і псіхалогіі.

Актуальнасць праблемы падрыхтоўкі педагагічных кадраў у рамках факультэта БІС узрастае па прычыне неабходнасці забеспячэння кваліфікаванымі кадрамі сярэдняга звяна падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў – вучылішчаў і каледжаў. Акрамя Магілёўскага бібліятэчнага каледжа, такія кадры рыхтуюцца ў Гродзенскім мастацкім вучылішчы. Гэта можа стаць стымулам для актывізацыі прафарыентацыйнай работы і падрыхтоўкі бібліятэкараў падчас школьнай адукацыі на базе вучэбна-вытворчых камбінатаў па прыкладу Лідскай ЦРБ імя Я.Купалы, бібліятэкары якой два разы ў тыдзень праводзяць заняткі для на-

вучэнцаў 10–11 классаў па бібліятэказнаўстве і бібліяграфазнаўстве, арганізуюць вытворчую практыку.

Улічваючы дачыненне кожнага школьнага настаўніка і супрацоўніка бібліятэкі да рашэння праблемы фарміравання інфармацыйнай культуры асобы, мэтазгодна было б прапанаваць і ў межах адкрытага ва універсітэце культуры факультэта дадатковай адукацыі павышаць або набываць кваліфікацыю ў разглядаемай прадметнай сферы названым катэгорыям спецыялістаў.

Падрыхтоўка спецыяліста з кваліфікацыяй «бібліятэкар-бібліёграф – выкладчык інфармацыйнай культуры» мае важнае значэнне, таму што ў інфармацыйным грамадстве па прагнозах футуролагаў, бібліятэказнаўцаў вядучых краін усё большую сацыяльную значнасць будзе займаць такая функцыя бібліятэчна-бібліяграфічных работнікаў, як навучанне ўсяго насельніцтва прыёмам работы з інфармацыяй, выхаванне яго інфармацыйнай культуры.

**П.Г.Игнатович**, *профессор*

# ФОРМИРОВАНИЕ КУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКОГО ЗНАНИЯ

Глубокие социокультурные изменения на всем постсоветском пространстве являются частью глобального изменения всех сфер жизни человечества, начиная от индустриальной до религиозной. Это глобальное изменение в жизни человечества вызвано многими факторами, важнейшими из которых являются демографический взрыв, лавинообразный информационный рост и научно-технический прогресс. В свою очередь эти факторы повлияли на увеличение угрозы экологической катастрофы, что, несомненно, ставит перед всеми странами мира вопрос о том, какими путями человек способен отодвинуть от себя угрозу вымира-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ